# ПЕРЫЯДЫ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ ТЭЛЕТЭАТРА БЕЛАРУСІ: АД ПЕРШЫХ ДЗЁН – ДА НАШАГА ЧАСУ

**Трапянок У.А.**
*загадчык аддзела навін культуры дырэкцыі канала "Культура" Беларускага радыё Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, магістрант УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (г. Мінск)*

Эра тэлебачання – аднаго з найбольш распаўсюджанага сродку сувязі і інфармацыі на сёння – пачалася ў Беларусі больш за паўстагоддзя таму: 1 студзеня 1956 года. Між тым, яшчэ задоўга да гэтай даты заўзятары кадраў, што рухаюцца на маленькім экране, эксперыментавалі з тэхнікай, каб паглядзець праграмы з іншых рэспублік. У 1934 годзе нават выйшла кніга «Тэлебачанне і тэлефатаграфія», у якой дэтальна апісвалася, як можна вырабіць тэлепрыёмнік на аснове дыска Ніпкова. Зразумела, стварэнне такіх прыёмнікаў было падуладна толькі самым кемлівым і тэхнічна адукаваным. У другой палове 1950-х вытворчасць тэлевізараў выйшла на рэспубліканскі ўзровень, паколькі ў Беларусі нараджалася ўласнае тэлебачанне. І хаця рэгулярныя тэлепраграмы Цэнтральнага тэлебачання СССР пачалі трансліравацца яшчэ ў кастрычніку 1931 года, Беларускае тэлебачанне вельмі хутка нагнала свайго галоўнага настаўніка і заканадаўцу ў вяшчанні.

Драма на БТ амаль з першых дзён яго існавання заняла пачэснае месца ў эфірнай сетцы. У 1956 годзе адзначалася 75-годдзе з дня смерці рускага пісьменніка Ф. Дастаеўскага. Каб ушанаваць памяць літаратара, айчынныя тэлевізійшчыкі на чале з рэжысёрам Ус. Кухтам узяліся за пастаноўку першага беларускага тэлеспектакля «Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары». Дзякуючы з'яўленню новага сродку масавай камунікацыі (а таксама сродку масавай інфармацыі) тэатр стаў яшчэ больш даступным для кожнага, хто меў дома тэлевізар. За першае паўгоддзе дзейнасці мінская тэлестудыя паказала два спектаклі, перанесеныя ў тэлепавільён з Купалаўскага тэатра: «У добры час» і «Апошнія». Таксама па БТ у той час вяліся трансляцыі спектакляў «Бацька і сын» маскоўскага Цэнтральнага тэатра Савецкай арміі і «Цудоўны сплаў» Іванаўскага абласнога драматычнага тэатра.

Пазней спектаклі з мінскай студыі дэманстраваліся амаль кожны месяц. Зразумела, паказваць іх часцей не было магчымасці, паколькі працэс стварэння тэлепастаноўкі, як тэатральнай ці на радыё, з'яўляецца справай далёка не аднаго дня. Тым не менш, тагачасныя супрацоўнікі БТ з імпэтам браліся за ўвасабленне творчых задум. У першы год працы айчыннага тэлебачання на экране паказалі трагедыі А.С. Пушкіна «Каменны госць», «Моцарт і Сальеры», серыю з працягам «Клуб славутых капітанаў», інсцэніроўку «Соцкі падвёў» паводле апавядання Я. Коласа і іншыя работы. Ішлі спектаклі нерэгулярна: напрыклад, у адзін месяц паказвалі дзве-тры пастаноўкі, у другі – да сямі.

Гісторыя беларускага тэлетэатра складаецца з некалькіх перыядаў творчых пошукаў і эксперыментаў. Гэты час ужо апісваўся навукоўцамі, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

займаюцца вывучэннем экранных мастацтваў краіны: В. Нячай, Н. Агафонавай. Мы дазволім сабе вылучыць яшчэ два сучасныя этапы, якія ўмоўна можна назваць перыядам поўнага заняпаду беларускага тэлетэатра і часам магчымага адраджэння і якія амаль ніяк яшчэ не вывучаліся.

Пачатковы этап ахоплівае гады ад з’яўлення мінскай тэлестудыі да 1968 года. Гэта час станаўлення беларускага тэлетэатра. Тагачасныя рэжысёры (А. Гутковіч, В. Карпілаў, М. Моін, Ус. Кухта) браліся за тэлеадаптацыю пераважна рускай класікі. Творы паводле айчынных аўтараў былі разовай з’явай. Тым не менш, значным дасягненнем 1958 года стала экранізацыя твора Я. Коласа «Сымон-музыка». Тэлеспектакль пад назвай «Песня музыкі» паставіў рэжысёр Ус. Кухта. Праект можна назваць своеасаблівым творчым прарывам, паколькі ўпершыню на мінскай студыі ажыццявілі пастаноўку вершаванага твора. Галоўную ролю ў спектаклі выканаў народны артыст СССР П. Дубашынскі. Акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы неаднаразова ўдзельнічаў у здымках на мінскай студыі, шмат запісваўся на Беларускім радыё. Спектакль «Песня музыкі» па праве называюць вяхой тэлевізійнага мастацтва. Пастаноўка ўнесла значны ўклад у нацыянальную культуру і развіццё тэатра яшчэ і таму, што здымкі праводзіліся не толькі ў тэлестудыі, але і на натуры – у Нясвіжы, Гарадзеі, Мірскім замку. Яшчэ адна адметнасць спектакля ў тым, што значнае месца адводзілася музыцы: выкарыстаны творы Я. Цікоцкага, Р. Пукста, народныя мелодыі.

Зварот да нацыянальнай літаратуры адбыўся ў 1960-я гады. Для пастановак у тэлетэатры адаптавалі раманы П. Броўкі, К. Чорнага, І. Шамякіна, І. Мележа.

У лістападзе 1965 года рэжысёр А. Гутковіч паставіў яшчэ адзін знакавы для нашай культуры твор – «Людзі на балоце» І. Мележа. Гэта першая трохсерыйная пастаноўка, здымкі якой таксама вяліся на натуры. У спектаклі працавалі артысты, чые імёны ўвайшлі ў «залаты фонд» прафесійнага тэатра Беларусі: Г. Гарбук, Л. Давідовіч, З. Стома, Г. Макарава, С. Станюта, П. Кармунін, В. Тарасаў. Спектакль, уганараваны Дзяржаўнай прэміяй СССР, трансліравалі таксама па Цэнтральным тэлебачанні.

Сярод іншых значных для Беларускага тэлебачання вылучаюць пастаноўкі паводле твораў «Трывожнае шчасце» І. Шамякіна, «Трэцяе пакаленне» К. Чорнага.

Творчыя пошукі працягваліся да 1968 года. Апрача таго, у той час актыўна запісваліся спектаклі, што ішлі на сцэне Беларускага тэатра імя Я. Купалы, Рускага тэатра імя М. Горкага, віцебскага тэатра імя Я. Коласа, ТЮГа БССР, а таксама творчых калектываў абласных тэатраў. У тэлеэфір выходзілі пастаноўкі МХАТа, Малога Тэатра Расіі, тэатраў з Ленінграда, Кіева, Вільнюса, Львова.

З 1969 года і да амаль 1980-х гадоў адзначаўся перыяд застою і вычарпанасці творчых ідэй. Гэта звязана яшчэ і з натуральнай з’явай у жыцці – зменай пакаленняў. Пераход кіравання творчым працэсам ад мэтраў да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маладых паралельна адбываўся ў Беларусі і ў Расіі, у прыватнасці, у Маскве, на якую арыентаваліся айчынныя творцы.

У пачатку 1970-х гадоў на тэлебачанне прыйшоў працаваць рэжысёр В. Раеўскі. Мастацтвазнаўцы і гледачы высока ацанілі яго пастаноўку «За шчасцем, за сонцам» паводле вершаў Я. Купалы. У спектаклі былі задзейнічаны акцёры-купалаўцы Г. Гарбук П. Кармунін, П. Дубашынскі, В. Тарасаў, Л. Давідовіч, М. Захарэвіч і інш.

Да 1977 года сярэдняя колькасць тэлеспектакляў, выпушчаных за сезон, не перавышала чатырох. Але ўжо з наступнага года драма зноў заняла пачэсную нішу ў праграме тэлеперадач. Пачаўся чарговы этап росквіту тэлетэатра. Рэжысёры смела бралі за аснову будучых пастановак пераважна беларускі матэрыял (як празаічны, так і вершаваны), не цураліся працаваць з малымі літаратурнымі формамі (пастаноўкі «Дзед Яўсей і Палашка» паводле М. Лынькова, «Дзеці настаўніцы» паводле І. Шамякіна). У творчай камандзе таго часу былі рэжысёры В. Забэла, В. Траццякоў, В. Карпілаў, В. Акімушкін, Л. Тарасава, Н. Арцімовіч, Г. Сакалова. В. Мацюшэўскі ў 1985 годзе ажыццявіў пастаноўку «Тыдзень капітанаў» паводле твора Й. Вандэлоа. Яе называюць найвялікшым узорам развіцця псіхадрамы ў гісторыі беларускага тэлетэатра.

Другая палова 1980-х гадоў, калі тэлебачанне набыло велізарную папулярнасць сярод гледачоў, у эфіры БТ з'явілася рубрыка «З нашай відэатэкі»: у праграму ўключалі пастаноўкі, што захоўваліся ў фондах. Працягвалася праца па стварэнні арыгінальных спектакляў. Да 1991 года, калі драма паступова выцяснялася з экрана трансляцыямі іншага роду, у беларускім тэлетэатры з'явіліся 46 спектакляў. Сярод іх «Апошняя ноч Алаізы» (рэж. Л. Тарасава, 1986), «Заўсёды Ваш Тарыч» (рэж. В. Вярбоўская, 1986), «Я, Іван Дамінікавіч…» (рэж. В. Забела, 1988), «Лісты так доўга ідуць…» і «Мая душа як ястраб дзікі» (рэж. Н. Арцімовіч, 1989, 1990). Рэжысёры спрабавалі аднавіць гісторыка-культурную радаслоўную краіны. Гэта час тэматычнага, жанрава-стылявога і камунікатыўна-мастацкага абнаўлення [5, с. 173]. Апрача таго, у гэты перыяд у тэлеэфіры з'явіліся перадачы, якія расказвалі пра тэатральнае жыццё. Праўда, іх выхад таксама не быў рэгулярным, да таго ж, тэмы, што ўздымаліся ў праграмах, вельмі хутка вычэрпвалі сябе, і выпускі ператвараліся ў сумныя «пасядзелкі» ў студыі.

У пачатку 1990-х на БТ з'явіліся новыя праграмы, якія ламалі стэрэатыпы, закладзеныя папярэднікамі. Пра тэатр з экрана па-свойму, сучаснай мовай апавядалі аўтары перадач «Тэатр у фатэлі», «Аб'ектыў – тэатр». Аднак у другой палове 1990-х, калі змены адбываліся ва ўсіх сферах жыцця краіны, Беларускае тэлебачанне закрыла ўсе праграмы пра тэатральнае мастацтва і, такім чынам, надоўга аддалілася ад яго.

Стартаваў чарговы перыяд поўнага заняпаду тэлетэатра, альбо перыяд «сну», звязаны, перш за ўсё, з камерцыялізацыяй тэлебачання. Пачынаючы з апошніх гадоў мінулага стагоддзя да пачатку 2013 года ў эфіры Беларускага тэлебачання цалкам не паказалі ніводнага спектакля, што захоўваецца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

архіве (а іх як мінімум 250), не вяліся таксама трасляцыі з драматычных тэатраў краіны і замежжа. Час ад часу выкарыстоўваліся фрагменты фондавых пастановак, калі тэлеперадача прысвячалася юбілею або дзейнасці якога-небудзь акцёра ці рэжысёра. Пра сучасны тэатр расказвалі хіба што ў інфармацыйных выпусках і перадачах, крыху ўзгадвалі ў тэлепраектах «Інстытут культуры», «Страсці па культуры», «Культурныя людзі», «Пра мастацтва» і інш.

Цяперашні перыяд са спадзяваннем хочацца назваць «часам магчымага адраджэння». У 2013 годзе ў медыя прасторы нашай краіны пачаў вяшчанне тэлеканал «Беларусь-3». У яго эфірным раскладзе маюцца фільмы-партрэты, прысвечаныя жыццю і творчасці акцёраў, рэжысёраў, мастакоў, сцэнографаў. Гэта работы, якія захоўваюцца ў тэле- і кінафондах Беларусі. Сваю нішу ў праграме занялі тэлеспектаклі, што захаваліся ў відэатэцы. У першыя месяцы працы, калі тэлеканал вяшчаў у тэставым рэжыме, спектаклі з фондаў БТ ішлі не ў самы зручны час – па буднях раніцай ці ўдзень. Гэта пазбаўляла працоўных людзей, вучнёўскую моладзь магчымасці глядзець спектаклі, не спрыяла прыцягненню ўвагі да выбраных узораў тэлетэатра і папулярызацыі драматычнага тэатра ў цэлым. Зараз жа тэледрама як найвялікшы ўзор тэлевізійнага мастацтва паказваецца з улікам прайм-тайм асаблівасцей: у нядзелю вечарам у рубрыцы «Тэатр. Выбранае».

Што да арыгінальных пастановак у студыі ці трансляцый з сучасных тэатральных падмосткаў, пытанне застаецца адкрытым, паколькі гэтая справа патрабуе вялікіх фінансавых і прафесійных укладанняў. Тым не менш, ужо можна смела казаць, што Беларускае тэлебачанне вярнулася да трэцяй, вельмі важнай функцыі, якой кіраваліся раней і прытрымліваюцца зараз вядучыя тэлеканалы планеты: не толькі інфармаваць і забаўляць, але яшчэ і выхоўваць.

1. *Курков, И. Н.* Белтелерадиокомпания. Мир живого эфира / И. Н. Курков. – Минск : Медиафакт, 2007. – 304 с.

2. *Трапянок, У. А.* Тэатр у эфірнай прасторы Беларусі: гісторыя, сучаснасць, перспектывы / У. А. Трапянок // V Няфёдаўскія чытанні «Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць» : матэр. рэсп. навук.-тв. канф., 29 сакавіка 2012 г. / БДАМ ; рэдкал.: С. П. Вінакурава [інш.] – Мінск, 2012. – С. 126–129.

3. *Тэатральная Беларусь* : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2003. – Т.1.

4. *Тэатральная Беларусь* : у 2 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2003. – Т 2.

5. *Экран и культурное* наследие Беларуси / А. А. Карпилова [и др.] ; вступ. ст. П.П. Латушко ; редкол. : А.И. Локотко, А.В. Красинский, А. А. Карпилова ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 383 с. : с ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ